Цана асобнага нумару 20 гр.

Opłatę pocztową uiszczono ryczałtem.

РЭХА ПРАЦЫ

Выходзіць два разы у тыдзень.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12—6 (Wileńska 12. m. 6) Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 да 3.	Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 1 зл. 50 гр., на 3 мес. — 4 зл., на паўгоду — 8 зл., на год — 15 зл., заграніцу ўдвая даражэй. Перамена адрэсу 30 гр.	Нянрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукаван. залежыць ад Рэдакцыі.	Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 грош. за радок пэтыту ў 1 шпальту.

№ 1 Вільня, Субота 1-га верасьня 1928 г. Год 1

Барацьба з самадзейнасьцяй масаў — на культурным фроньце.

Пасьля доўгае падгатоўкі ўрадавае прэсы, пасьля „услужных" даносаў „нашых" буржуазных часопісаў —новы ўдар па беларускай культурнай працы стаўся дакананым фактам. 28-га жніўня Таварыства Беларускае Школы, адзіная запраўды паважная культурная ўстанова наша, атрымала ад віленскага гродзкага старосты паперу аб тым, што дзеяльнасьць Таварыства уладамі „завешана". Аднача сна ў памяшчэньне Галоўнае Управы ў Вільні зьявілася паліцыя, пазабірала ўсе кнігі і канцылярыю Таварыства, а памяшчэньне і ўсе рэчы апячатала.

Як паведамляе польская прэса, аднача сна такі-ж „налёт" зроблены на аддзелы і гурткі Таварыства на правінцыі.

У афіцыяльных матывах, апублікаваных у польскіх газэтах, Таварыству закідаюцца гэткія „праступленьні": што яно „знаходзіцца пад уплывам антыпаньствовых і вывратовых элемэнтаў", „што рад паасобных аддзелаў (гурткоў) быў апанаваны гэтымі элемэнтамі", ды што „моладзь, якая вучыцца ў беларускай гімназіі, была месцам сталага і сыстэматычнага фэрмэнту".

Так заявіў дэлегатам, якія зьвярнуліся ў справе „завяшэньня" да ваяводзтва, заступнік ваяводы, шэф бясьпечнасьці („ахранкі") п. Кіртікліс.

Чытаючы гэты ўрадавы камунікат, робіцца неяк дзіўна і незразумела: у чым тут справа? Здавалася-бы, што, калі ў нейкім таварыстве ёсьць сябры, якія, паводле слоў п. Кіртікліса, зьяўляюцца „антыпаньствоўцамі" і „вывратоўцамі", дык улада мае поўную магчымасьць вясьці з імі барацьбу ўсімі даступнымі ей способамі. Але, каб ужыць гэтых способаў („Лукішкі", „Вронкі" ды іншыя падобныя), і ў сучаснай Польшчы вымагаецца, каб гэтыя „антыпаньствоўцы" і „вывратоўцы" не ў галаве толькі хавалі свае „праступныя" думкі, але каб выявілі іх на дзеле—канкрэтнымі паступкамі. Але аб такіх канкрэтных паступках ня толькі Таварыства ў цэлым, але і паасобных „антыпаньствовых" і „вывратовых" сяброў Таварыства шэф „бясьпечнасьці" нічога ня кажа...

Затое недасказанае прадстаўніком ураду дасказала ўрадавая газэта „Слово". Яна выразна кажа, што справа тут у тым, што ў Таварыстве пануе ідэалёгія працоўных масаў—сялянска-работніцкая, з якой улада пагадзіцца ня можа, хоць сяляне і работнікі зьяўляюцца як-быццам такімі самымі паўнапраўнымі грамадзянамі дзяржавы (прынамся на паперы—папера „усё церпіць"!), як і паны абшарнікі ды ксяндзы, якім даецца поўная магчымасьць вясьці іхнюю культурную працу ў духу ідэалёгіі пануючых клясаў... І, паводле слоў органу пана міністра Мэйштовіча, урад гадоў дазволіць вясьці культурную беларускую працу такім верным буржуазіі людзям, як Янка Станкевіч, з яго „Зьвязам" (пэўна-ж!), „Прасьвеце" і т. п. арганізацыям, але ніколі ня дасьць займацца гэтай працай людзям, нямілым буржуазіі.

Але-ж справа ў тым, што „пацяшаньне" польскае прэсы, быццам „Зьвяз" ды „Прасьвета„ пяроймуць працу Таварыства Беларускае Школы, ды быццам гэтак ніякае шкоды беларускай культурна-нацыянальнай працы ўрад ліквідацыяй Таварыства ня робіць, — гэта пустыя і манлівыя словы, пісаныя з поўнай сьвядомасьцяй іх ілжы для — заграніцы. Бо ведама роўна добра нам, як і польскім уладам, што ані „Зьвяз", ані „Прасьвета" — да ніякае запраўднае культурнае працы ня здольны й рабіць яе ня могуць: яны ня маюць ані інтэлектуальных сілаў, без падтрыманьня якіх у нас наагул працаваць немагчыма. Дык „люкі" (пустога месца) пасьля зьліквідаваньня Таварыства, калі ўрад пойдзе ў гэтым кірунку да канца, ніякія „фігуранты"... з наймітаў дэфэнзывы — не запоўняць.

Мы з поўным пераканаьнем павінны тут сцьвярдзіць, што, ня гледзячы на ўсе „тлумачэньні" ці то прадстаўнікоў улады беспасрэдна, ці праз купленых пісакаў, быццам „завяшэньне" і спадзяваная ліквідацыя Таварыства Беларускае Школы „ня б'е па беларускай культурнай працы, — гэты крок польскага ўраду іменна пагражае разьбіць адзіную народную культурна-асьветную арганізацыю больш, як з 10 тысячамі сяброў, у якой згуртаваліся ўсе чынныя на гэтай ніве элементы, якія з сваіх дробных складак грашмі, быццам з цэглін, самі сваімі рукамі будуюць вялізны гмах беларускае культуры — галоўную падставу нашае будучыні. Мы сцьвярджаем, што Таварыства—гэта адзіная арганізацыя сьвядомых нацыянальна элемэнтаў нашае вёскі, у якой збуджаная самадзейнасьць масы можа знайсьці для сабе выхад на груньце запраўды-ж творчае, а не дэструкцыйнае працы. І калі ўрад пазбавіць беларускія працоўныя масы гэтага выхаду, калі гэтыя масы аканчальна пераканаюцца, што польская буржуазія засудзіла іх на сьмерць, і свой прыгавор маніцца выпаўніць з усей насьледавальнасьцяй і няўхільнасьцяй, дык гэтыя масы — зусім натуральна — ад творчае працы будуць прымушаны перайсьці да аднаго, што ім астаецца: да дэструкцыі...

Мы мусім зьвярнуць увагу польскаму грамадзянству, а асабліва працоўным масам, што гэтае заганяньне прабуджанае творчае энэргіі масаў у падпольле можа справацыраваць дужа цяжкія пасьледзтвы. Можа некаму такое правакаваньне нашага сялянства і работнікаў і пажадана, але мы мусім ад правакацыі бараніцца.

У ўрадавым камунікаце сказана, што п. Кіртікліс узалежніў далейшы лёс Таварыства Беларускае Школы ад становішча сяброў Таварыства ў адносінах да вымаганьняў уладаў. Паскольку гэтыя вымаганьні, аб якіх у камунікаце нічога не гаворыцца, будуць датыкацца зьмены ідэалёгіі тых запраўды народных элемэнтаў, што згуртаваліся ў Таварыстве дзеля культурнае працы (а на гэта як — быццам паказуе стацьця „Слова", аб якой мы ўспаміналі), дык мэта „завяшэньня" і праектаванае ліквідацыі Таварыства выявіцца ўва ўсей сваей цынічнай шчырасьці.

Гэтымі нашымі ўвагамі мы пакуль-што абмяжымся, чакаючы выясьненьня ўтварыўшагася палажэньня. Адзначым тут толькі адно: што нашай культурнай працы ужо зроблены страшэнна цяжкі ўдар, бо там—на правінцыі—паліцыя з усей энэргіяй пэўне-ж кінулася нішчыць гурткі Таварыства Беларускае Школы, і пэўне-ж навет у выпадку зьняцьця „завяшэньня" далёка ня ўсё можна будзе адбудаваць.

„Новы курс" у польскай палітыцы, кіраванай „адзінкай", дае ўжо свае плады...

Трохі сьвету на цёмныя справы PPS.

Перадвыбарчая гарачка, у якую кінуліся розныя „партыі" і „партыйкі", прынясла заядлую барацьбу і палеміку, паміж рознымі групамі і партыямі, бо кожны хацеў паказаць свой лепшы бок і ўкалоць праціўніка.

З палемікі паміж пэпэсоўскім „Работнікам" і п. Аліцыяй Бэлцікоўскай выйшла на сьвет надзвычай цікавая вестка, якая нячувана абурыла працоўныя масы. Вышэй успомненая А. Бэлцікоўская пачала цьвердзіць, што Маліноўскі (званы „Войткам") — лідэр пэпэсаў супрацоўнічаў з дэфэнзывай і „што ўстановай палітычнай дэфэнзывы карыстаўся для мэтаў партыйных".

Мала таго, што пэпэсы памагаюць капіталістам праводзіць капіталістычную рацыяналізацыю працы, кідаючы работнікаў у найбольшы вызыск, мала таго, што ламаюць забастоўкі арбітражам, што на дэманстрацыях, як гэта было ў Варшаве на 1-га мая, арганізоўваюць „боювкі" з браўнінгамі і кіямі нападаюць на мірна дэманструючых рабочых, мала таго, што яны здрадзілі рабочай клясе, заслужылі імя сацыял фошыстаў, але яны яшчэ супрацоўнічаюць у дэфэнзыве і „установу палітычнай дэфэнзывы выкарыстоўваюць для мэтаў партыйных"! Гэтага яшчэ не хапала да цэлага кампляту?

Але, як ведама, „таварыш пасэл" „Войтэк" Маліноўскі „ня прызнаў сябе вінаватым" і справа пайшла ў маршалкоўскі суд.

„Крук круку вока ня выдзяўбе"—кажа старая пагаворка, так сталася і з „Войткам": маршалкоўскі суд яго апраўдаў і закіды А. Бэлцікоўскай прызнаў беспадстаўнымі.

А. Бэлцікоўская мусіла падпарадкавацца прыгавару маршалкоўскага суду, але ўсё-ж хоча апраўдацца перад „публічнай апініяй" і з гэтай мэтай выпусьціла да Маршалка Сойму п. І. Дашынскага адкрыты ліст, у якім, як сама піша, „агранічваецца толькі для прадстаўленьня Пану Маршалку некалькіх найважнейшых момантаў, якія пазволяць Яму ацаніць аб'ектыўна ход справы".

Далей сцьвярджае, што:

1) „Мае паказаньні, даныя Маршалкоўскаму Суду 5 га чэрвеня, ня былі стэнаграфаванымі і наагул не запісваныя, а ход таго паседжаньня ня быў занесены ў пратакол"...

2) „Вядучы нараду і абвяшчаючы прысуд, Маршалкоўскі суд ня меў маіх паказаньняў, якія, з прычыны адказу другі раз праслухаць мяне праз Суд, напісала сама і выслала ў Суд 28 ліпня гэтага г. заказным пісьмом № 13641 на рукі П. Віцэмаршалка кс. Сэвэрына Чэтвэртынскага"...

3) „Не разгледжана ўрадавыя дакуманты, на якія паказала ў часе маіх паказаньняў"...

4) „Выслухана з боку пасла Маліноўскага, як сьведкаў, п. п. Вацлава Масьлянкевіча і Франука Ябчынскага"..., якіх „дамагалася абавязкавага выключэньня, бо ад двух гадоў яны са мною маюць судовую справу, цывільную і карную"..., апрача таго, „ня ведаюць яны нічога аб справе, над якой ідзе нарада Маршалкоўскага Суду"...

5) „Ня вызвана і ня выслухана паданых праз мяне сьведкаў"... Далей ідуць прозьвішчы гэтых сьведкаў.

Вышэй сказанае дае права сумлявацца, што да правільнага, ці лепш сказаць, справядлівага прыгавару Маршалкоўскага Суду.

Далей, каб падцьвердзіць свае закіды, А. Бэлцікоўская ў гэтым аткрытым лісьце друкуе пісьмы яе сьведкаў. Уладзімер Віскоўскі, арганізатар і першы кіраўнік аддзелу палітычнай паліцыі ў Польшчы, цяпер вышэйшы ўрадовец Палескага Ваяводзтва і рэдактар часопісі „Палесьсе", між іншым у лісьце да А. Бэлцікоўскай піша:

„Сцьвярджаю, што пры арганізацыі і кіраваньні ў працягу першага году існаваньня палітычнай паліцыі (Аддзел Інфармацыйны Кам. Гал. П. П.) дазнаваў помачы і цешыўся з супрацоўніцтва значнага ліку сяброў або б. сяброў арганізацыі П. П. С. Атрымліваў стуль кандыдатаў на функцыянэраў і рад інфармацыяў. Утрымліваў пасрэдна і беспасрэдна сувязь з п. паслом Мар'янам Маліноўскім і іншымі сябрамі П. П. С. Лучнікам быў п. Кальніс-Краеўскі. Змушаны, аднак, перасьцерагчы, што супрацоўніцтва гэтае было прадыктавана тагачаснымі палітычнымі варункамі, абапёртае было на ідэйвай падкладцы, маючы на мэце абарону пару месяцаў існуючай Дзяржавы перад унутраным раскладам. Супрацоўніцтва гэтае, з боку П. П. С. і асабліва пасла Маліноўскага ня мела на мэце ні матэр'яльнай, ні палітычнай карысьці, ня мела значыцца ніякіх ганьбуючых прыметаў. Усё-ж была фактам".

Другі сьведка п. Ф. Галінскі, сябра рэдакцыі „Кур'ера Паранняга" ў Варшаве, б. надкамісар палітычнай паліцыі, між іншым, таксама ў сваім пісьме піша:

1) „пасол Мар'ян Маліноўскі заставаўся ў кантакцэ з начальнікам Аддзелу IV Д. Мін. Спраў Унутраных (Палітычная Паліцыя), бываючы ў яго бюры, пасьля чаго — ня раз былі ўзмоцнены рэпрэсіі проці крайніх адзінак".

Значыць пэпэсы рабілі так: калі ў іхняй партыі хто пасьмеў іх крытыкаваць, дэмаскаваць іхнюю здрадзіцкую палітыку, ці навет пакідаў партыю, дык тады які небудзь „лідэр" ішоў у бюро і „пасьля чаго былі ўзмоцнены рэпрэсіі да крайніх адзінак", ці проста—напраста саджалі за... краты.

Адносна да паказаньняў п. Сьцяпана Лэнскага, публіцыста, б. шэфа палітычнай паліцыі ў Варшаве (1923 — 24 г.) піша да А. Бэлцікоўскай п. Язэп К. Альшэўскі:

„На пытаньне сьвярджаю, што Сьцяпан Лэнскі 2 жніўня г. г. ў Варшаве у маёй прысутнасьці сказаў:

1) што, вызваны як сьведка на Маршалкоўскі Суд, сцьвердзіў у сваіх паказаньнях, што, стаўшы ў 1923 г. шэфам палітычнай паліцыі ў Варшаве, давэдаўся ад сваіх калегаў, ахвіцэраў паліцыі, аб тым, што пасол Мар'ян Маліноўскі супрацоўнічаў з палітычнай паліцыяй.

2) што шмат людзей з варшаўскай арганізацыі П. П. С. супрацоўнічала, у часе яго ўрадаваньня, з падпарадкаваным яму ўрадам".

Дык, ці М. Маліноўскі і наагул пэпэсы супрацоўнічалі з дэфэнзывай, ці не? Ці прыгавар Маршалкоўскага Суду ў гэтай справе справядлівы?

Няхай адкажуць на гэтыя пытаньні самі чытачы.

Пётра Жвір.

Нямеччына, Францыя і эвакуацыя Надрэніі.

Зусім неспадзеўкі, 23-га жніўня ў Элісейскім Палацы ў Парыжы была склікана францускiя Рада Міністраў. Гэта выклікала вялікае зацікаўленьне навет і ў апусьцеўшых з поваду одпускаў палітычных цэнтрах, як Францыі, так і заграніцы, бо-ж было ведама, што францускія міністры зьбяруцца толькі ў начатку верасьня, калі якраз і канчаюцца іх вакацыі.

Што-ж гэта за прычына сабраньня францускіх міністраў?

Сама Рада Міністраў прызнала патрэбу паразуменьня міністраў, якія прыедуць падпісаць пакт Кэллёга. Але-ж ці можна ў гэта паверыць. Ці можна паверыць, што дзеля ўкладу парадку прыняцьцяў і дзеля ўкладу „меню" банкетаў патрэбна склікаць усіх міністраў.

Тут пэўна штосьці іншае.

Нямеччына даўно ўжо як высунула спробу прысьпяшэньня эвакуацыі Надрэніі, цьвердзячы, што далейшая акупацыя яе ня мае ніякага сэнсу на падпісаньні лёкарнскага дагавору.

Новы нямецкі канцлер, Гэрман Мюлер, выразна сцьвярджае гэта ў сваей праграмавай дэкларацыі з 3-га ліпня. Пры гэтым ён дадае, што зьвязаньне гэтай справы „з іншымі беспадстаўнымі справамі" не [illegible] мець ніякага мейсца. Палітычны-ж і [illegible] прыяцель Штрэзэмана, пасол Б[illegible] фон Рэйбабэн, ідзе яшчэ далей у выд[illegible] ім нядаўна на гэтую тэму брашуры. Эвакуацыю Надрэніі бяз ніякіх адкладаў і варункаў ён лічыць за „жыцьцёвыя правы" Нямеччыны, папярэджваючы пры гэтым Францыю, што „Нямеччына ніколі не адмовіцца ад высілкаў, усунуць тыя несправядлівасьці, якія зрабілі Нямеччыне на Усходзе" (польская граніца). Але гэта яшчэ ня ўсё. Каталіцкая „Гэрманія" зьмясьціла 3 г. жніўня артыкул, у якім кажа, „што пакуль Францыя будзе пратэставаць проці прылучэньня да Нямеччыны Аўстрыі і забранага Польшчай „калідору", датуль ня можа быць ніякай гутаркі аб паразуменьні каміж Нямеччынай і Францыяй".

Гэтыя сталыя дамаганьні Нямеччыны — зьнясеньня францускай акупацыі і перагляду ўсходніх граніцаў і ёсьць прычынай неспадзяванага скліканьня францускай Рады Міністраў.

Занепакоенаму гэтай справай францускаму ўраду патрэбна ўстанавіць нейкую лінію, нейкую праграму адносна тыкх дамаганьняў Нямеччыны, з якой-бы згаджаліся ўсе міністры, належачыя да розных палітычных партыяў. Апрача гэтага, Францыі трэба паразумецца і са ўсімі саюзнымі з ею дзяржавамі, бо-ж усім хіба ведама, што справа Надрэніі, справа перагляду, „усходніх граніцаў" Нямеччыны (з Польшчай), ня ёсьць справай выключна нямецка-францускай, а агульна саюзьніцкай.

Гэта і ёсьць галоўная, у міжнародным маштабе, прычына скліканьня францускай Рады Міністраў.

З другога боку, важнай тут прычынай зьяўляецца і тое, што некаторыя францускія ўплывовыя часопісі, як напрыклад „Vo-

ante“ лічаць, што не патрэбна зьвязваць „Рэйн з Віслай“.

Дык ці ня будзе прысьпешана справа эвакуацыі Надрэніі і перагляду ўсходняй граніцы, вынікам падпісаньня працівваеннага пакту Кэлёга?

Што-ж гэта нарада французскіх міністраў мае супольнага з беларускай справай?

Трэба адзначыць, што паднясьце пытаньня аб усходніх граніцах Няметчыны ёсьць наліччай справай і беларускага працоўнага народу над Польшчай. Усім вядома, што на зьмену сучасных сваіх граніц Польшча ніколі не дазволіць—ні ўрад Пілсудзкага, ні іншыя ўрады Польшчы. Горны Сьлёнск і так званы калідор з Данцыгам гэта ёсьць эканамічная аддушына Польшчы, адзіны выхад да мора, да якога Польшча імкнулася ў працягу свайго непадлеглага жыцьця і да якога будзе імкнуцца. Польска-літоўскі канфлікт гэта толькі надцьвярджае. Дык паўстае пытаньне, што-ж з гэтага выйдзе?

Няметчына, развязаўшы сабе рукі на Захадзе, скіруе ўсю сваю ўвагу на Усход. Тут могуць выйсьці ўсялякія магчымасьці, як для Польшчы, таксама і для Заходняй Беларусі, справа аб якой, пэўне ж, будзе разглядацца калісьці на будучым міжнародным кангрэсе. Чакаем.

З дняўніка вязьня.

22-га траўня г. г. у аўторак, якраз на Міколу, усе грамадзісты спакойна чакалі, чакалі калі павядуць на... суд? Гэта быў апошні дзень пасьля трохмесячнай цеганіны, дзень прысуду, адначасна і... радасны і... страшны. Прыблізна ў $10^1/_2$ гадз. рана пачалі нас выводзіць, як заўсёды, па 8 чалавек, толькі ўжо ня туды, куды вазілі заўсёды. Зьехаліся... Сустрэліся ўсе ў пакоі для арыштантаў. Прывітаўшыся, сталі нэрвова хадзіць па „пакоі“ то ўдоўж, то ўпоперак. Усе былі даволі задуманыя. Відаць, у кожнага ў душы была няпэўнасьць: што будзе? Хаця кожны пэўны быў прысуду. Настрой быў, як перад... грымотамі.

А 12 гадз. і мінютаў 5 увайшлі ў залю суду. Карэспандэнтаў было цэлая „Грамада“, публікі як ніколі. Акружыла нас моцным і густым ланцугом паліцыя. Усе стаялі. Чутно йдзе суд... возны крыкнуў: „йдзе Суд, прашу ўстаць“! Але ніхто ня ўстаў, бо... усе стаялі. Напружыўшы слух, з прытоеным духам, нат здаецца і сэрца перастала стукаць, каб не перашкаджаць вушам — услухаліся... Суд чытае: „w imieniu Rzeczypospolitej“... І, як гром, валяцца словы прысуду, 12... 12... 12... 12... 8... 8... 6... 6... 6... гадоў цяжкага вастрогу. Дзевятнаццацёх апраўдана.

Публіка з слявамі: „хай жыве Грамада“! абсыпала нас дажджом жывых красак: чырвонымі, ружовымі, белымі і жабінымі вочкамі (незабудкамі). Я падняў толькі дзьве красачкі чырвоненькія, якія мне дарагі, як успамінак аб тэй чараўніцы-волі, якой сягоньня яшчэ „шмат“ беларусаў карыстаюцца — (ці на доўга?).

Грамада з усіх і шчырых грудзёў, стройна, у адзін голас, які ўзьнімаўся аж да... неба, загрымела: „Ад веку мы спалі“... Пазволілі нам прапяяць першую і апошнюю зваротку. Уся заля стаяла. Выйшлі ў пакой для арыштантаў.

Ніколі і нішто не вяжа так моцна людзёў між сабою, як супольны прысуд! Колькі было абнімкаў, пацалункаў! Усе зьліліся ў адну жывую істоту, усе адно думалі,—адным жылі. Усім была дарагая толькі—адна—вольная, сярмяжная, галодная, няшчасная Бацькаўшчына! Ніхто ня плакаў, каціліся толькі сьлёзы, нейкае таемнае радасьці... Надзеі...

Тыя, якія апраўданы, пачалі па адным выходзіць, на разьвітаньне кланяючыся ды махаючы рукамі.

Мы асуджаныя па 5-х з утроенай „апекай“ паехалі на... Лукішкі. Едучы, адзін у аднаго пытаемся: „За што??? Адказу ніхто ня даў“...

Прыехалі. Пасадзілі нас па двох, толькі ня ў тыя каморкі, з якіх паехалі на... суд. Каморка, у якой я сядзеў да суду, была шэрая, да якой і сонца ніколі не хацела заглянуць, з вечным сутонкам. Цяперашняя — з жоўтымі сьценамі і, вакно ня так, як у той,назірала на шэрыя сьцены вастрогу, а выходзіла на „вольнае“ поле з паўночнага боку вастрогу. Як толькі ўвайшлі ў каморку, нахмарылася неба, загрымелі грымоты... пайшоў залацісты дожджык (мо' каб ачысьціць паветра нашае Бацькаўшчыны?).

Потым хутка выясьнілася, стала хараша, пачалі птушкі цюрукаць... Я, стаўшы на табурэтку зірнуў за краты. На другім паверсі з вакна відзен быў вельмі, вельмі прыгожы малюнак: гарысты край каханае Вільні. Горы былі апранутыя ў зялёныя, прыгожапышныя майскія шаты. Праз вакно маніла-клікала да сябе, да жыцьця, чараўніца-каралева—...Вясна!..

„Ну што-ж, падумаў я“, шчасьліў і той, хто нясе крыж за родную справу....

Лукішкі,
22/V. 1928 г.

С. Ш.

Палітычная хроніка.

У Польшчы.

Прэм'ер Бартэль і зьмена Канстытуцыі.

Пазнанская прэса інфармуе, што прэм'ер Бартэль у дарозе да Варшавы заявіў аднаму бэрлінскаму карэспандэнту, што зьмена Канстытуцыі вельмі блізкая.

Ініцыятыва зьмены Канстытуцыі выходзіць ад Б. Б.

Таму-ж карэспандэнту прэм'ер заявіў, што ў першых днях будучага тыдня скліча Эканамічны Камітэт Рады Міністраў, на паседжаньнях якога будзе эдэцыдавана справа ўмовы з Гарыманам (справа прадажы яму прамысловых гутаў Верхн. Сьлёнску).

Праект новага тэрыторыяльнага падзелу Польшчы.

Маёр Генэральнага Штабу Раман Стажыньскі апрацаваў новы праект тэрыторыяльнага падзелу Польшчы.

Паводле гэтага праекту, Польшча будзе падзелена на 6 правінцыяў. Кожная правінцыя будзе складацца з некалькіх аднаімільённых ваяводстваў.

Сталіцы правінцыяў маюць быць у: Варшаве, Вільні, Кракаве, Пазнані, Львове і Любліне.

У кожную з іх будзе ўходзіць ад 3 да 5 ваяводстваў, з местапрабываньнем уладаў II інстанцыі і ваяводзкімі ўрадамі разам з так-званымі ўрадамі (ўстановамі), ня злучанымі ў местапрабываньні ваяводстваў.

Наагул у-ва ўсей Польшчы будзе 25 ваяводстваў, лічачых ня больш, як па-паўтара мільёна чалавек.

Ці ня прэтэнсыя гэта на некую папяровую „аўтаномію“ ці „фэдэрацыю“ з „Крэсамі“?!

Украінізацыя праваслаўнай царквы ў Польшчы.

Старшыня Праваслаўнай Царквы ў Польшчы, мітрапаліт Дзяніс, выдаў да праваслаўнага духавенства распараджэньне, у якім прызнае ўкраінскую мову за адну з раўнаправных царкоўных моваў і загадвае падўладнаму духавенству памагаць праводзіць украінізацыю багаслужэньняў і абсалютнае ўжываньне ўкраінскай мовы ў казаньнях (пропаведзях) і на лекцыях рэлігіі ў школах.

Трэба гэтага самага спадзявацца і ў адносінах да праваслаўнага беларускага духавенства.

Як бачым, дык духоўныя ўлады ў Польшчы шмат прабяглейшыя за сьвецкія, бо гэты новы „курс“ духавенства, зусім страціўшага ўплывы ў сялянскіх масах, ня больш і ня менш, як „хапаньне тапячагася за саломінку“.

Цікава, як польскі ўрад глядзіць на сваю сітуацыю „на Крэсах“: ці ён лічыць, што яшчэ „рана“ хапацца за гэтую „саломінку, ці што ўжо позна“...

Хвароба Дашынскага.

Львоўская прэса падае, што прабываючы на летніх „вывчасах“ (адпачынку?!) у Трускаўцу маршалак Сойму Дашынскі захварэў на грыпу.

Польшча збраіцца.

25 г. жніўня ў Каннэ (Францыя) спушчаны на ваду пазабудаваны для Польшчы контрміналосец „Burza“, на 1540 тоннаў паемнасьці.

Там жа будуюцца і тры польскія падводныя лодкі: „Wilk“, „Żbik“ і „Ryś“.

А ўлады прапануюць мір, падпісваюць розныя „працівваенныя“ амэрыканскія і неамэрыканскія міравыя праекты!..

Жалезнадарожная катастрофа.

Уночы 25 г. месяца на станцыі Конайды здарылася жалезнадарожная катастрофа. Вышаўшы з Варшавы кур'ер, курсуючы на шляху Варшава—Гданск, наехаў на асабовы цягнік. Ад удару 3 апошнія вагоны выкалеіліся. Адзін з іх ударыўся аб паравоз стаячага цягніка і моцна паламаўся; 2 другія пацярпелі крыху менш.

Раненых і патоўчаных—15 чалавек.

Грознае зьявішча ў млынарскім промысьле.

„Głos Prawdy“ (№ 232) піша, што апошнімі днямі працадаўцы млынарскага промыслу ў Варшаве адкінулі трываўшую ўжо 2 гады зборную ўмову. Умова гэтая абавязвала іх да 7 верасьня г. г. У сувязі з гэтым 30 жніўня мела адбыцца першая канфэрэнцыя работнікаў і працадаўцаў для падпісаньня новай умовы.

Газэта зазначае, што працадаўцы маюцца паменшыць плату. Тымчасам прафэсыянальны саюз млынарскіх работнікаў адкідае ўсякую магчымасьць зьменшаньня платы і ў разе няўступлівасьці працадаўцаў пагражае забастоўкай.

Такое становішча зьяўляецца запраўды грозным, бо ў разе проіграшу варшаўскіх млынарскіх работнікаў, працадаўцы-млынары ўсей Польшчы пачнуць „урэзваць“ плату сваім работнікам.

Але ж хіба ў варшаўскіх работнікаў хопіць сьведамасьці важнасьці сваей справы.

Дык хай-жа гэтае „грознае зьявішча“ (пакуль што яшчэ ня ведама, для каго), будзе повадам для працоўных выказаць усю сьведамасьць і салідарнасьць сваіх інтарэсаў і патрэбаў, за плячамі якой стаіць іх поўнае вызваленьне з-над вызыску „хлебадаўцаў“.

Забастоўка электрамантэраў.

У Варшаве ўсё яшчэ трывае забастоўка электрамантэраў.

25 жніўня адбылася канфэрэнцыя работнікаў-электрамантэраў і працадаўцаў у справе зьліквідаваньня забастоўкі, выкліканай жаданьнем работнікаў 25 прац. падбаўкі. Прадстаўнікі працадаўцаў згадзіліся на 25 прац. падбаўку толькі ад 15 кастрычніка г. году, калі скончыцца абавязваючая цяпер умова і будзе надпісана новая.

Да 15 кастрычніка—прадстаўнікі прадпрыемцаў „зaахвяравалі“ работнікам 6 прац. падбаўкі.

Прадстаўнікі работнікаў зажадалі 25 прац. падбаўкі зараз-жа.

Канфэрэнцыя разьехалася бяз ніякага дадатняга пасьпеху. Забастоўка трывае.

Дэфраўдацыя ў варшаўскім магістраце.

Голасная нядаўна справа надужыцьцяў кіраўніка Крэдытовай Сэкцыі Варшаўскага Магістрату Шкарадзінскага пачынае выясьняцца. Між іншым, выяўлена, што Шкарадзінскі „прысвоіў“ прынятыя гор. Магільнам абліґацыі на суму 76,000 рублёў.

Шкарадзінскі звольнены са службы і арыштаваны. Спадзяюцца, што ў гэтай справе замешана яшчэ некалькі чалавек, арышту якіх чакаюць у „хуткім часе“.

І камісіі бастуюць?

На 24 жніўня ў Варшаве было склікана паседжаньне Галоўнай Камісіі дзеля досьледаў над узростам коштаў пражыцьця.

Але сябры Камісіі не зьявіліся.

І гэта ўжо трэці раз, як гэтая Камісія склікаецца, але ня зьбіраецца.

Ці то паны забаставаліся, ці загуляліся?!

Камуністычная дэманстрацыя ў Лодзі.

З поваду паўторнага арыштаваньня звольненага нядаўна з турмы (па 4-х гадах сядзеньня) былога камуністычнага пасла Ланцуцкага, у Лодзі адбыліся камуністычныя дэманстрацыі.

Дэманстрацыі пачаліся з колькі-гадзіннага пратэсту палітычных вязьняў у Лодзі, зажадаўшых пракуратара і пачаўшых пяяць інтэрнацыянал.

Адначасна перад вастрогам зьявіўся „вялікі натоўп іх таварышоў“ (так называе кам. дэманстрацыю „Rplita“ ў 246 №), памагаючых ім звонку ў пратэсьце.

У хуткім часе зьявіліся ўзмоцненыя аддзелы пешай і коннай паліцыі, якая і разагнала дэманстрантаў, арыштоўваючы „апіраўшыхся прадстаўнікам публічнага парадку“.

Буржуазная прэса падае, што арыштаваных толькі 8 чалавек.

Пасьля гэтага яшчэ доўгі час зграмаджваліся ў розных месцах групы камун. моладзі, крычаўшай свае „антыдзяржаўныя“ лёзунгі, а на розных мурах і сьценах зьявіліся розныя „напісы“.

Упалявалі... камсамольцаў.

Як інфармуе варшаўская прэса (Rzeczpospolita № 241), у сувязі з надыходзячым сьвятам камуністычнай моладзі (2 верасьня), варшаўскія камуністы распачалі ажыўленую дзеяльнасьць.

Паінфармаваная аб гэтым паліцыя разагнала аднаго дня адно з такіх сабраньняў камсамольцаў у Варшаве. Акружыўшы дом, паліцыя і выведоўцы „втаргнэлі“ ў сяродак, дзе арыштавалі 8 наступных „выўротовцув“: Мячыслава Віцінскага, Зыгмунта

А. Рэйзін.

„Стары працаўнік“.

Вайцех пасварыўся са сваім гаспадаром, уласьнікам вялікай друкарні.

Крыўдна! гаварыў сам да сябе праз увесь дзень. Трэба было маўчаць. 25 год працаваў, працаваў, быў верны, як сабака, а цяпер, калі ўжо галава поўна сівых валасоў, на табе, шукай новых гаспадароў!

Работа валіцца з ягоных рук, а машыніст друкарні, высокі немец, з кручанымі вусамі, злуецца:

Ты сёньня Вайцех п'яны, ці што?

Парражнены такім нядобрым пытаньнем, Вайцех забыўся аб старшынстве і злосна адказаў:

Я ня ведаю хто п'е, я ці пан?

— Ага, так і ты пачынаеш мне гаварыць насупроць — разгневаўся машыніст— добра! добра!

За гэта „добра“, добра“ Вайцех палохаецца так, што аж трасе яго. Ён ведае, што дзякуючы гэтаму „добра“ — „добра“, адмовілі ў прошлым годзе ў службе аднаму рабочаму Стаху, каторы і да гэтага часу не знайшоў сабе яшчэ працы. Ен яго бачыў на прошлым тыдні, валяючагася каля мосту ў кумпаніі п'яніц і басякоў.

І Вайцех хавае глыбока ў сэрцы рэшту гонару, каторы застаўся ў яго яшчэ ў працягу 25 гадоў службы ў друкарні, і больш мягкім голасам зварочваецца да машыніста.

Я не разумею, чаго Вы сёньня такі злы. Ці-ж тэта грэх, калі часам выпіваеш троху гарэлкі...

Але замест таго, каб папра віць настрой, ён сапсаваў яшчэ больш. Машыніст глядзіць на яго сваімі злымі, шэрымі вачыма і крычыць:

— Ты замаўчыш! ці не!

Усё прапала: думае ў страху Вайцех, і бярэцца за работу, падаваць паперу ў машыну. Машыніст крычыць ізноў:

Якую паперу ты прынёс, ідыёт? „Няшчасьцьце пачынаецца“! думае Вайцех і рукі ягоныя апускаюцца.

Прышоўшы да хаты, фізычна і духова змучаны, Вайцех кінуўся на лаву, каторая служыла ложкам для яго і жонкі, і сумна глядзеў.

— Будзеш есьці? спытала жонка, да часу састарэўшая кабета з патухшымі вачыма і ўпаўшай грудзьдзю.

Вайцех не адказаў.

Чаму ты такі здэнэрвованы? бядуючы пытала яна, гледзячы на свайго мужа вернымі вачыма.

Вайцех не адказваў.

Жонка занепакоілася і спытала зноў:

— Можа ты хворы?

— Хворы!!! схапіўся Вайцех — не дачакаюцца гэтага яны.

Ды злосна паглядзеў на жонку і бурчэў:

— Іншага слова, як хворы, у яе няма.

Жонка пачала слаба бараніцца:

Хай мае ворагі хваруюць, я так сабе... ты такі здэнэрвованы...

— Здэнэрвованы... шаптаў Вайцех, чаго я здэнэрвованы... я сьмяюся з усяго гэтага... я пасварыўся з гаспадаром... За 25 гадоў, нічога, можна сабе пазволіць адзін раз у працягу 25 гадоў, адказаць гаспадару. Я адных гадоў з ім, а працаваў я больш за яго... Жонка зразумела, што Вайцех сёньня перасаліў. Сэрца пачало палохацца і ёй хацелася яго троху пажурыць: Чаму? Але крыху баючыся Вайцеха, а крыху з спачуваньня, яна мягка зьвярнулася да яго:

Не бядуй, ён цябе ня звольніць...

Звольніць... хай звальняе... злаваўся Вайцех ! колькі яшчэ цярпець! 25 гадоў адслужыў, хопіць!... Я сам адмоўлюся...

Сказаў ён гэта толькі для таго, каб супакоіць сваё гора, але зараз-жа, ён зусім сур'ёзна прагаварыў:

Досьць! 25 гадоў! Я спрабую сваё шчасьце ў іншым мейсцы...

На заўтра Вайцех устаў раней, як заўсёды. Але працаваць ён пайшоў на гадзіну пазьней. Як ён спазьніўся на гэту гадзіну, ён сам ня ведае: чорт і сёньня ўмяшаўся. Ён ясна бачыць, што ўвесь кусок, каторы выткалі 25 гадоў, пачынае рвацца... Гэта быў шэры кусок, але цэлы і пэўны. Што цяпер будзе? Сам Бог гэтага не згадае.

Падыйшоўшы да двара, дзе знаходзілася друкарня, ён застанавіўся, паглядзеў на вокны, каторыя замест мілага прывітаньня, якое ён атрымоўваў кожную раніцу, злосна глядзелі на яго, як учора вочы гаспадара, калі ён яго нібы то абразіў. Шум машын, нібы прадказваў нядобры канец. Тры разы ён перахрысьціўся, кажучы: „Божа памажы твайму рабу“! і ўвайшоў у фабрыку.

На няшчасьце гаспадар быў унізе. Пабачыўшы яго, Вайцех ня меў дзе схавацца і змушаны быў астацца чакаць вымовы ад гаспадара. Але гэты яго не заўважыў і гутарыў з машыністам.

Вайцех адчуваў, што гэты кусок, шэры даўгі кусок рвецца на заўсёды на векі; направіць гэта ня можна і ён адчуваў, што павінен нешта рабіць. Так стаяць няма чаго і абліваючысь халодным потам ён выгаварыў.

— Пане гаспадар. Я хачу рахунак... Вайцех чакаў вялікага афэкту. Пасьля 25 гадовай працы прасіць рахунак, здараецца ня кожны дзень. Але яго просьба не зрабіла ўражаньня. Ён спрабуе галасьней сказаць; чаго ён баіцца — ён-жа ня хлопчык:

— Я хацеў папраеіць у гаспадара рахунак! — прагаварыў ён яшчэ раз больш цьвёрда, а сэрца білася, як у разбойніка.

— Я чуў... холадна адказаў гаспадар— прыйдзеш пазьней...

„Значыць ён прыймае маю адмову“ дзівіўся Вайцех, не разумеючы нічога.

Ён пачуў сябе такім малым, такім паўшым, што ён дзівіўся, як гэта ён, Вайцех, мог праслужыць у такога добрага гаспадара 25 гадоў. Гэта мусіць была памылка. Дзіўная памылка.

Ён паглядзеў навакол сябе, на скрыню, якую ён мусіў-бы вынесьці на панадворак. Значыць яго скрыня. Але цяпер гэтыя скрыні яму былі такія чужыя, як гаспадар, як уся друкарня і ён ніяк ня мог зразумець, як гэта ён тут праслужыў аж 25 гадоў... Гэта памылка, вялікая памылка. Разьбіты зусім ён выйшаў на панадворак, дзе і астанавіўся ня ведаючы куды ісьці... Туды ісьці ён павінен а першай гадзіне... Ісьці да хаты, немагчыма, ён там звар'юе. Можа зайсьці зноў да гаспадара, упасьць к нагам і сказаць:

— Даражэнькі, я толькі пажартаваў, пашто мне адходзіць, я цябе люблю, я люблю друкарню, гэтыя скрыні, каторыя трэба выносіць, я ўсё люблю, я так да ўсяго прызвычаіўся... 25 гадоў, гэта-ж ня жарты... Я гэта жартаваў, даражэнькі, даруй...

Але ногі яму ня служаць, каб зрабіць хоць крок і, пачэсываючы патыліцу, ён кажа бязрадна:

Эт, да ўсіх чарцей, хай будзе! хай будзе!

Ён выйшаў з панадворку. Але куды ён пойдзе? Шукаць працы ў іншым мейсцы ён ня мае права, бо ён яшчэ ня чуў рашучага адказу ад гаспадара, ён ня мае права... Паперш ае ён павінен пажагнацца з ім добра, падзякаваць яму за хлеб і соль, хай ня думае, што Вайцех які небудзь лобуз, клапец... не! Вайцех разумее, як трэба абходзіцца.

Так, ён пачакае яшчэ крыху, ён зойдзе за рахункам, яму належыць за два тыдні: панядзелак, аўторак, выходзіць гэта каля...

Галава яго такая цяжкая ад думак, што ня можа навет зьлічыць.

Лугоўскага, Сьцяпана Браткоўскага, Абрама Леціяскага, Егуда Кранцэнблюма, Аляксандра Кавальскага, Вацлава Голэнбёўскага і Рахіль Гагман.

Украінскі тэрарызм.

Надовячы ў аколіцах Львова знойдзены труп забітага „ляяльнага“ валаснога асэсара і кандыдата на валаснога старшыню ў Воўчыицу, нейкага Наваградзкага.

Сьледства быццам усталіла, што гэта справа ўкраінскіх тэрарыстаў, сярод якіх арыштавала 5 чалавек.

Пажар фабрыкі.

20-га жніўня ў ткацкай фабрыцы фірмы Грунтштэйна у Лодзі выбух пажар, спаліўшы бяз мала ўсю фабрыку.

З прычыны пажару 300 працаваўшых там работнікаў страціла працу.

Заграніцай.

Адповедзь Вальдэмараса маршалку Пілсудскаму.

27 га жніўня 1928 г. на зьезьдзе ў Уцянах літоўскі прэм'ер Вальдэмарас сказаў вялікую прамову, якую можна лічыць за адповедзь на прамову Пілсудскага на зьезьдзе легіяністаў у Вільні.

Паводле прэсы, Вальдэмарас быццам сказаў, што легіяністы закончылі свой зьезд выкрыкам: „давай нам Коўню“. Літвіны-ж, кажа Вальдэмарас, адказваюць на гэта: „Літва ніколі не супакоіцца бяз Вільні“. Гэтая акалічнасьць, што трэцяя частка літоўскай тэрыторыі знаходзіцца пад уладай Польшчы, заўсёды зьяўляецца галоўнай заботай Літвы. Але як справядлівасьць знаходзіцца на баку Літвы, дык і ўвесь літоўскі народ падтрымлівае палітыку свайго ўраду ў Віленскім пытаньні.

„Барацьбу за Вільню — сваю народную сьвятасьць, літоўскі народ будзе і далей весьці мірным шляхам. Дух, які пануе ў незалежнай Літве, сягае і за дэмакрацыйную лінію“, дзе ўсе чакаюць часіны новага аб'яднаньня Літвы. Літоўскі ўрад ня раз абвяшчаў усім, што дыпляматычныя і кансулярныя зносіны з Польшчай не магчымы датуль, пакуль Вільня ня будзе сталіцай Літвы.

Зварачваючыся да слоў марш. Пілсудскага: „Вільня мусіць быць маей“ і на ўспамін аб Вільні, як аб вялікодным падарунку легіяністаў, Вальдэмарас кажа, што гэты факт прыпамінае памёршыя часы, калі цэлыя тэрыторыі з жывучымі на іх людзьмі, цэлыя народы лічыліся за прадмет прыватнай уласнасьці. „Аднак сам польскі народ“, канчае Вальдэмарас, „разумее, якая несправядлівасьць робіцца Літве, і ніколі ня будзе бараніць Вільні. Літоўскі народ будзе з нецярплівасьцю чакаць часіны, калі праб'е гадзіна новага аб'яднаньня Літвы“.

На гэтым зьезьдзе было каля 10 тысяч чалавек. Зьезд ухваліў рэзалюцыю, салідарызуючыся з заграцічнай палітыкай ураду.

Мусім адзначыць, што прамову Вальдэмараса польская прэса падала тут вельмі няпоўна, але і з гэтага хіба добра відаць, як стаяць адносіны Польшчы і Літвы, а разам з гэтым, як цяжка Польшчы перад сусьветнай апініяй утрымаць пры сабе нашу, а ня польскую і літоўскую Віленшчыну. Мы маўчым, але-ж гэта ня значыць, што і будзем маўчаць.

Падпісаньне процi-ваеннага пакту Кэллёга.

27-га жніўня г. г. у Парыжы падпісаны процi-ваенны пакт Кэллёга. На ўрачыстасьць падпісаньня прыехаў і сам аўтар пакту Кэллёг. Прыехаў ён у Парыж у вялікай таямніцы, бо баяліся, каб з прычыны ўгодкаў сьмерці Сакко і Ванцэці ня было на яго замаху. Цягнік, вязучы Кэллёга, прыбыў на колькінаццаць мінют раней і на зусім другі тор. Каб яшчэ лепш змыліць выабражаных „замахоўцаў“, на пэроне фальшывага шляху было выстаўлена шмат паліцыі, а на пэроне праўдзівага шляху не наставілі ні аднаго паліцыянта, затое дужа сышчыкаў.

Так панам заўсёды сьніцца работніцкая помста, што-ж „мусіць суменьне ня чыстае“.

Прыехаўшы, Кэллёг зрабіў візыт Брыяну, наступна ўсе паўнамоцнікі падпісваючых дзяржаваў былі запрошаны Прэзыдэнтам Францыі на „сьняданьне“. Апрача заграцічных гасьцей, на сьняданьні былі прысутнымі і ўсе сябры ўраду і многа розных высокіх і вядомых дзеячоў. Спадзяюцца, што пасьля падпісаньня пакту, будзе парушана справа прысьпяшэньня эвакуацыі Надрэніі.

Нямецкая прэса адносіцца да гэтых „нарадаў“ зусім пэсымістычна—кажа, што калі яны і будуць, то ў некарысных варунках для эвакуацыі Надрэніі, справы „Аншлюсу“ (прылучэньня Аўстрыі) і перагляду ўсходніх граніц

Орган францускіх камуністаў „Гуманітэ“, дэкляруе, што ў дзень падпісаньня пакту, адбудуцца камуністычныя маніфэстацыі, дзеля падчыркненьня салідарнасьці з СССР, як не запрошанай дзяржавы працоўных, процi міжнароднага капіталізму.

Палітычныя гутаркі.

На пярэдадні падпісаньня пакту началіся палітычныя гутаркі і нарады (закулісныя), пасьля якіх Кэллёг запрасіў усіх на абед.

Гутарка Штрэзэмана і Пуанкарэ.

Нямецкая прэса падае, што хутка па падпісаньні пакту паміж Штрэзэманам і францускім прэм'ерам Пуанкарэ адбылася гутарка, трываўшы аж паўтары гадзіны, заместа прадбачанай паўгадзіны. Гутарка адбылася ў кабінэце Пуанкарэ.

Штрэзэман аб пакце.

У гутарцы з прадстаўнікамі парыжскай прэсы, Штрэзэман выказаў задаваленьне пактам, кажучы, што гэта новы доказ францускa-нямецкага збліжэньня і першы крок да рэалізацыі Злучаных Штатаў Эўропы. Далей Штрэзэман кажа, што накрэсьленая ў пакце праграма вымагае сьціслага францускa-нямецкага супрацоўніцтва, абапертага на справядлівасьці і роўнасьці.

Француская прэса разыходзіцца ў ацэнцы пакту. Адны часопісі прыдаюць вялікае значэньне прыезду ў Парыж Штрэзэмана, другія прыезду Кэллёга. Іншыя газэты цьвердзяць, што карысьць францускa-нямецкага паразуменьня Штрэзэман бачыць толькі для Нямеччыны, а іншыя кажуць, што подпіс Нямеччыны зьяўляецца парукай міжнароднай салідарнасьці.

„Известия“ аб пакце.

(Паводле Пата). Пішучы аб даручэньні ўраду СССР запросінаў на падпісаньне пакту Кэллёга, „Известия“ падкрэсьліваюць, што гэты крок, хоць мо' і ня прыемны для некаторых з 15 першых удзельнікаў пакту, быў прымусовым у сувязі з прыняцьцем публічнай эўрапэйскай і амэрыканскай апініямі дэклярацыі радавага ўраду, сьцьвярджаючай, што пакт бяз удзелу ў ім СССР можа быць скіраваным процi Радаў.

Далей, сьцьвярджаючы пэўнае адхіленьне ад першага кірунку пакту, на якое мусілі згадзіцца яго ініцыятары, „Известия“ падчырківаюць, што адначасна з уваходам пакту ў жыцьцё аднолькава як для першых яго 15 удзельнікаў, так і для пазьнейшых, гэта пазбаўляе першых яго ўчасьнікаў свабоды агрэсыўнай акцыі ў адносінах да тых дзяржаваў, якія ня бралі ўчасьця ў цэрэмоніі 27 жніўня г. году ў Парыжы.

Запрашэньне СССР да пакту Кэллёга.

„ТАС“ падае, што францускі амбасадар Гэрбэттэ ўручыў Літвінаву, на падставе інструкцыі свайго ўраду, запрашэньне ўраду СССР да ўдзелу ў пакце Кэллёга.

Ад імя свайго ўраду амбасадар Гэрбэттэ заявіў Літвінаву, што гэтае прыступаньне да пакту адбудзецца на тых самых варунках і з тымі самымі прывілеямі, якія прызнаны ўжо падпісаўшым яго дзяржавам.

Апрача гэтага, Гэрбэттэ ўручыў Літвінаву копію падпісанага пакту. Літвінаў яшчэ папрасіў даручэньня яму ў афіцыяльнай форме сьпіска ўсіх урадаў, да якіх высланы падобныя запросіны і ўсе дакумэнты, становячыя дыпляматычную карэспандэнцыю ў справе пакту, асьвядчаючы пры гэтым, што гэтыя інфармацыі будуць патрэбны радаваму ўраду пры разглядзе даручанай празіцыі.

СССР і Афганістан.

Амэрыканскія прадстаўнікі ў дзяржавах, не запрошаных яшчэ да падпісу пакту, паведамілі іх аб варунках прылучэньня да пакту. СССР і Афганістан, як дзяржавы ў якіх няма прадстаўнікоў Зл. Штатаў, будуць паведамлены аб гэтых варунках пры пасярэдніцтве францускіх дыпляматычных прадстаўнікоў.

Радавы „абсэрватар“ у Жэнэве.

Нямецкая прэса ў Жэнэве падае, што туды прыехаў радавы абсэрватар Барыс Штэйн, які браў удзел у разбраенёвай камісіі. Прыезд Штэйна ў Жэнэву, дзе ён мае ца афіцыяльна даручыць старшыні разбраенёвай камісіі одпіс радавай ноты, выклікаў у Жэнэве вялікае ўражаньне.

Эвакуацыя Надрэніі.

„Бэрлінэр Тагэблят“ падае, што стараньні дыпляматычных прадстаўнікоў Нямеччыны ў Парыжы, Лёндане, Рыме і Брусэлі, пазваляюць спадзявацца, што канцлеру Мюлеру ўдасцца на верасьнёвай сэсіі Лігі Народаў паставіць справу эвакуацыі Надрэніі.

Рады і разбраеньне.

Абгаварваючы пісьмо Літвінава, высланае ім да старшыні прыгатаваўчае камісіі разбраянёвай канфэрэнцыі, „Известия“ атакуюць Лігу Народаў, за адклад разгляду радавага праекту разбраеньня.

„Ратыфікацыя“ трактату ў Нэттуно югаслаўскім „парлямантам“.

Харвацкія газэты пішуць, што—ў часе галасаваньня ў справе ратыфікацыі Трактату ў Нэттуно—ў югаслаўскім парляманьце был прысутных усяго 87 паслоў. Такім чынам, справаздача з паседжаньня парляманту, на якім быў ратыфікаваны гэты Трактат, прыняты быццам большасьцю 158 паслоў (?), зьяўляецца, кажуць газэты, звычайным, (ці—вярней: надзвычайным!) машэнствам... З гэтых лічбаў харвацкая прэса выводзіць бясспрэчна, што ўрад ня мае большасьці ў парляманьце, прынамсь — у справе ратыфікацыі трактату.

Салодкія надзеі белградзкага ўраду — на раскол у апазіцыі.

Белградзкі ўрад пільна сачыць за настроямі і выпадкамі ў Загрэбе, дзе засядае „парлямант апазіцыі“—асобна ад „урадавага парляманту“ ў Белградзе. Белградзкія ўрадавыя колы ня трацяць надзеі на тое, што розьніцы паміж рознымі групамі апазіцыі ўрэшце разваляць адзінства процi—радавага блёку ў Белградзе. Напрыклад, пагляды новага павадыра партыі „сялян-харватаў“, докт. Мацэка, — значна розьняцца ад праграмы Прыбічэвіча, павадыра сэрбскіх „незалежных дэмакратаў“. Докт. Мацэк стаіць за самастойнасьць Харватыі, а Прыбічэвіч—за непахільнае дзяржаўнае адзінства Югаславіі (?). Вялікую радасьць у Белградзе выклікала зьмешчаная ў газэце Радзіча заметка, якая кажа, што толькі і выключна павадыры сялянска-харвацкай партыі маюць права кіраваць усей апазіцыйнай тактыкай. Быццам гэта заметка скіравана процi Прыбічэвіча, які быццам — пасьля сьмерці Радзіча—лічыць сябе галоўным павадырам усей апазіцыі.

Якраз у венскіх газэтах надрукавана гутарка з Прыбічэвічам, які заявіў, што такія лічныя ў апошні час гутаркі розных павадыроў апазіцыі зусім не выражаюць апініі ўсей апазіцыі, а ёсьць толькі іх асабістым паглядам.

Канчальная праграма апазіцыі, казаў ён, яшчэ толькі мае быць апрацавана на паседжаньні Галоўнай Управы ўсей коаліцыі якое мае адбыцца 23 жніўня ў Любляне (ў Славеніі). Места Любляна выбрана дзеля таго, каб паказаць усяму сьвету, што акцыя сялянска-дэмакратычнай апазіцыі не абмяжоўваецца харватамі і сэрбамі, але захоплівае ўсе краі і народы Югаславіі, у тым ліку і славенцаў. Прыбічэвіч асабліва падчыркнуў, што барацьбы сялянска-дэмакратычнай апазіцыі няможна прадстаўляць, як барацьбу харватаў процi сэрбаў,—бо-ж у склад апазіцыйнай коаліцыі ўваходзяць сэрбы—з усіх частак Югаславіі. У канцы—ў справе ратыфікацыі Трактату ў Нэттуно — Прыбічэвіч заявіў, што гэта пастанова Сойму будзе сумным успамінам для Югаславіі.

Нічога — пацяшае ён сам сябе, гаспадар не захоча маіх грошы... ён ня скруціць...

Ён злуецца, што гаспадар ня ведае, як ён Вайцех добра думае цяпер аб ім. Але ён яму скажа:

Гаспадар, я да вас нічога ня маю...

Але, ён яму так скажа. Ён „вдохновляецца“ і ў яго зьяўляецца дзікая ідэя. Калі ён атрымае грошы, ён пацалуе яму ў руку, як вымагаецца.

— Гэта будзе зусім прыгожа!

Але ён баіцца аднаго: галава ў яго закручана, ён можа яшчэ забыцца...

І ён паўтарае гэта некалькі разоў:

Гаспадар, я да Вас нічога ня маю! А пасьля гэтага пацалаваць у руку...

Ён робіцца весялейшым і пэўным, што ўсё пройдзе добра... Але ня доўга малявала яму фантазія гэты рысунак. Ходзячы туды і назад недалёка ад друкарні, куды ён кожную хвілю кідаў любоўныя пагляды, ён патроху пачаў бачыць голую запраўднасьць, галодную, адзінокую і яго трасло.

— Глупства, казаў ён — я-ж не магу так адыйсьці... гэта-ж немагчыма... прабыў 25 гадоў і так сабе пайсьці... гэта ня можа быць!

Трэба паправіць. Ён зойдзе і скажа так:—Вы не павінны мяне адпусьціць... Вы губіце мяне, што значыць, 25 гадоў я прабыў у Вас, хто мяне возьме цяпер... стары, хворы...

О, не! схопліваецца ён... хай яго Бог сьцеражэ гэтакае казаць... ён яшчэ не стары, яму ўсяго 60 гадоў, ягоны бацька працаваў да 75 гадоў. Хворы наказўна не... што значыць хворы! Калі часам забаліць сьпіна, дык пашто гэта павінен ведаць гаспадар? Ці гэта бацька, што ён будзе прад ім бедаваць?..

Але думка, што ў апошнія часы, сьпіна яму часцей баліць, не дае—яму пакою.

Праўду кажучы, то і нячэсна з майго боку хаваць праўду... працаўнік павінен быць здаровым, асабліва пры маёй рабоце... цягнуць купы паперы і скрынкі, трэба мець сілы. Мне гэтага ўжо бракуе... Але! але! мне бракуе! Такую рэч ня можна хаваць... я буду горш за злодзея, калі я гэта схаваю, ён павінен усё ведаць, захоча то будзе трымаць, не—то не! Накідвацца гаспадару ня можна...

І ён пастанаўляе, зайсьці да гаспадара, сказаць яму ўсю праўду і хай ён ведае, хто такі Вайцех...

Ідучы да гаспадара, ён спаткаў рабочых, якія ішлі з друкарні.

Добры-дзень! сказаў ён ім... ужо на „абед“?

— Ці ты ня тутэйшы? замест адказу спытаў зьдзіўлена адзін рабочы.

Я... прабарматаў Вайцех... я брацьця звальняюся з фабрыкі... хі-хі-хі—ужо час!..

Дык ты ўжо змучыўся? сьмяяўся рабочы—брыдка! Што значыць змучыўся? бараніўся Вайцех,—так сталася, Бог так хоча... будзьце здаровыя, дзеткі... я іду жагнацца з гаспадаром... 25 год адслужыў... я нічога ня маю да яго... мне належыцца яшчэ за два дні... глупства—ён заплаціць... ён за 25 год заплаціў, то і за два дні заплаціць...

Ён неяк дзіўна рассмяяўся, малады рабочы хацеў яму нешта адказаць, але другі яго перабіў:

— Хадзем, чаго ты тут астанавіўся бедаваць?..

— Ідзеце, ідзеце, браты, есьці! зьвярнуўся ласкава Вайцех. Калі небудзь яшчэ спаткаемся... О, так! мы яшчэ пабачымся.

Але ён сам адчуваў, што ён сам ня верыць у свае словы і ён заўважыў, як далёка ён цяпер ад тэй моладзі, каторая пайшла хуткімі крокамі, а яго пакінула аднаго...

— Хай ім Бог паможа! Я да іх нічога ня маю!—прабарматаў ён і скіраваўся ісьці да гаспадара па рахунак...

Перакл. з жыд. Э. Залкінд.

Радуйцеся і весяліцеся!..

Таварыства Беларускай Школы, гэтай наймагутнейшай культурна-асьветовай установы Заходняй Беларусі няма. Працоўны беларускі народ пазбаўлены магчымасьці свабодную хвіліну правадзіць і духова аддыхаць у роднай яго душы атмасфэры. Працоўны Беларускі Народ нечыяй рукой пхаецца ў царства цемры, каб на дне ён знашоў сабе забвеньне ў чарцы. Дарогу да кабакоў і рэстаранаў далі.

Хто гэта пакіраваў гэтай нябачанай у культурнай дзяржаве справай, каму гэта было на карысьць?

Таму, каму Т-ва Беларускае Школы стаяла на перашкодзе.

Дык Станкевічы і розныя „Міны“ радуйцеся і весяліцеся, бо сьвята на вашай вуліцы, радуйцеся і весяліцеся, бо вы дапялі свае мэты, радуйцеся і весяліцеся, бо Беларускі Народ занясе гэты факт у гісторыю свайго культурнага і нацыянальнага адраджэньня і вас, як біблейская гісторыя Каіна, занясе да здрайцаў і прадажнікаў свайго народу. Вы гэтага жадалі, Вы да гэтага імкнуліся і Вы гэтага дачакалі.

Дык яшчэ раз радуйцеся і весяліцеся!

А нам з „сюрпрызамі“ спатыкацца ня першы раз. Плачучы.

Наша хроніка.

Таварыства Беларускай Школы і рэдакцыя „Саха“ зачынены. Па загаду польскіх уладаў ўночы з 28 на 29 жніўня г. году зачынена (zawieszona w czynności) Т-ва Беларускае Школы.

Згодна з гэтым загадам, па распараджэньню „Гродзкага Староства“ ў Вільні тэй-жа ночы апячатана паліцыяй Галоўная Управа Т-ва Беларускай Школы, месьцячаяся ў Вільні на вул. Сьв. Ганны № 2. Апечатваючы Галоўную Управу, паліцыя забрала частку канцэлярскіх кнігаў.

Галоўнай Управе Т-ва Бел. Школы дано 14 дзён на „абжалаваньне“.

Арыштаў яшчэ пакуль што ня было, але хіба хутка будуць, бо гэта тая „ласка“ для беларусоў, на якую нам ня прыходзіцца доўга чакаць.

У гуртку Т-ва Беларускай Школы на Новым Сьвеце (у Вільні) таксама былі вобыскі, гдзе забралі пратаколы сходаў, квітарыюшы, застаўшыяся ад вечарын і розныя рахункі.

З правінцыі яшчэ вестак ня маем. Згодна апошніх вестак — бліжэй, што ўсюды — спакой.

Да гэтай справы вернемся ў наступным нумары, да часу выхаду якога яна шмат больш зьясьніцца.

Як нас паведамляюць, нібы „ўсеміласьцівейша“ дазволена склікаць Агульны Зьезд Т-ва для перавыбару Галоўнай Управы і цяпер зложана спэцыяльная камісія, якая і займецца скліканьнем зьезду.

Ці-ж гэтая Галоўная Управа „ненадзёжная“? Нешта дзіўнае робіцца нечая ўмелая рука ходзіць.

Аднячасна з Галоўнай Управай Т-ва Бел. Школы запячатана і рэдакцыя сельскагаспадарчае часопісі „Саха“, для якой Т-ва гасьцінна адпусьціла бясплатна памяшчэньне.

Трэба адзначыць, што „Саха“ адна з старэйшых існуючых часопісяў, першыя нумары якой вышлі яшчэ ў „нашу-ніўскую“ эпоху. Закрыцьце яе, калі гэта ня ёсьць паліцэйская „абмылка“, ня можам вытлумачыць, бо калі аб закрыцьці Т-ва ўжо даўно хадзілі чуткі, дык „Саха“ займала тякое скромнае месца ў жыцьці беларускага руху, што факт апячатваньня яе ня даўся шмат каму для веры. Але-ж... беларуская, ды яшчэ апалітычная часопісь, дык і яна пэўне, мазоліла камусьці вочы...

Сталяры ўсё бастуюць. У Вільні ўсё яшчэ (больш 3-х тыдняў) трывае забастоўка сталяроў, выкліканая не выпаўненьнем работніцкіх дамаганьняў—50 прац. падбаўкі.

Бастуюць работнікі ўсіх прафэсіянальных саюзаў, ня гледзячы на іх палітычныя орыентацыі. Перагаворы „ваюючых“ старон давялі да таго, што працадаўцы ўжо прызналі некаторыя жаданьні бастуючых. Некаторыя-ж фірмы прызналі слушнымі ўпоўнасьці дамаганьні работнікаў, якія ўжо і пачалі працаваць. Рэшта работнікаў бастуе.

Галадоўка палітычных вязьняў. Надовячы ў старай Вялейцы выбухла галадоўка палітычных вязьняў. Галадаючыя жадалі: прадаўжэньня спацэру, палепшаньня ежы і вопраткі, адровьніваючайся ад крымінальных.

Такія весткі аб гэтай галадоўцы падае польская прэса.

Рэзультаты галадоўкі яшчэ ня ведамы.

Злавілі камуністаў. Надовячы польскія пагранічнікі затрымалі на радава-польскім пагранічча ў раёне Івянца 3 падазроныя асобы, якія быццам намерваліся перайсьці ў Рады. Сьледзтва, быццам, выказала, што гэта сябры зьліквідаванай камуністычнай ячэйкі.

Высяленьне расейскіх манархістаў. На моцы пастанаўленьня Мін. Унутр. Спраў з дня 24 жніўня г. году, прымусова высяляюцца з абшараў Польшчы, як „уцяжлівыя чужаземцы“, 5 пражываючых у Вільні расейскіх манархістаў.

Высылаюцца: сын праваслаўнага сьвяшчэньніка — Гапановіч, Мусьлін, Дзянісаў, Самахвалаў і Мікасевіч. Усім ім дана 2 нядзелі часу на зьліквідаваньне сваіх спраў.

Вымененыя зьярталіся з просьбай на пазваленьне ўезду ў Латвію у латвійскі кансулят, але там ім адмовілі сталай візы.

Цікавы працэс. Нядаўна закончыўся ў Вайсковым Акружным Судзе ў Вільні двухдзённы працэс нейкага харунжага Валінскага.

Справа ў тым, што ў кастрычніку 1925 года, некая пані Бутурлінянка, уласьніца маёнтку Буйвідзішкі, атрымала ананімны ліст, аўтар якога, пагражаючы сьмерцьцю у разе адмовы, загадваў палажыць у акрэсьленым месьце канвэрт з 500 злотымі. Перапалоханая пані так і зрабіла, і атрымала за палажаныя грошы паквітаваньне: „Муха-Міхальскі“.

У мінулым годзе такая „прапазіцыя“ паўтарылася ізноў. Гэтым разам аўтар ананіму зажадаў 1000 злотых. Пісьмо было падпісана ад імя тэрорыстычнай групы Выканаўчага Камітэту Саюзу Партыі Зах. Беларусі (?) (Zw. P. Z. B. — як падае віленская прэса).

Але пані паведаміла аб гэтым паліцыю (сьледчую), якая і пахавалася ў патрэбным часе ў ўслоўленым месьце магільніку. Агенты хутка заўважылі зьбліжаючуюся групку кавалерыстаў. Кавалерысты спыніліся перад брамай, адзін з іх зьлез з каня (хар. Валінскі) і сказаў ад'ехацца, а сам пашоў на могільнік і забраўшы з умоўленага мейсца канвэрт з грашыма вярнуўся назад. Тут на яго напалі „вывядоўцы“ і закавалі ў кайданы. Харунжы пачаў крычаць. На крык зьбегліся жаўнеры, але „вывядоўцам“ удалося іх угаварыць, і тады харунжы Валінскі быў прывезены ў палкавую канцылярыю.

Падсудны хар. Валінскі да ўдзелу ў гэтай справе ня прызнаваўся. Але каліграфічны аналіз каліграфа Качара станоўча цьвярдзіць, што аўтарам двух вымененых ананімаў зьяўляецца падсудны харунжы.

Апіраючыся на гэтым, вайсковы суд прысудзіў харунжага Валінскага на 2 гады цяжкага вастрогу і на выдаленьне з войска.

Цікава было-б ведаць, што было-б калі-б Валінскі быў беларусам?

— Няма хіба сумліву, што яго засудзілі-б найменш як на 12 гадкоў, дый, апрача гэтага, „вывядоўцы“ пастараліся-б (о, яна гэта ўмеюць!) выкрыць усе тэрорыстычную арганізацыю „выўротоўцоў“,— „комунізуёнцых бялорусінуў“,—ад імя якой харунжы Валінскі апошні раз падпісаўся. Больш комэнтарыяў не падаём...

Ці-ж ня добры сьведка? Апошнімі днямі выязная сэсія Акружнага Суду ў Вільні разглядала ў Браславе справу жыхароў Браслава, селяніна Лісоўскага і нейкага Язэпа Маркевіча, якія абвінавачваліся ў абакрадзеньні паштовага ўраду ў Мёрах. Адказвалі з турмы, куды іх засадзілі зразу па западозраньні ў кражы.

І вось, пры разглядзе справы аказалася, што яна ня можа быць разгляданай далей, бо галоўны сьведка абвінеьня, былы кіроўнік „абакрадзенага“ ўраду пошты, Францішак Пашкевіч, сядзіць цяпер у турме на Лукішках, за дэфраўдацыю (далікатна — за казённую кражу).

З такой прычыны суд адлажыў разгляд справы і на просьбу адваката згадзіўся падсудных сялян выпусьціць пад дазор (нагляд).

Ці-ж ня сам толькі „начальнік“ і абакраў сваю ўстанову, а каб ня было на яго ніякага западазрэньня, дык скінуў бяду на нявінных беларускіх сялян, але пабачым, што выясьніцца на судзе.

Бываюць выпадкі, што і беларусы апраўдваюцца, але, ой... як рэдка.

Значэньне эспэранта.

Сучасную пару характэрызуюць добрыя рэчы: „самаход, самалёт, радыё“.

Патрэбы, на выкананьне якіх раней вымагаліся тыдні часу і навет месяцы, цяпер залагоджваюцца хутка. Народы і дзяржавы міма волі пачалі зносіцца між сабой часьцей, а цяпер зносіны зьяўляюцца патрэбай штодзеннага жыцьця. У гэтых узаемнаадносінах вялікаю перашкодаю зьяўляецца вялікая колькасьць моваў. Напрыклад—у радыё. Не разумеючы мовы, ня можам да апошняга карыстацца тым, што дзеецца праз радыё у сьвеце. А моваў налічваецца да 1500, акрамя мясцовых асаблівасьцяў і іх адценкаў. Над гэтым думалі ня мала. Ня мала ламалі галаву, якую з існуючых моваў зрабіць агульнаю міжнароднаю моваю. І пераканаліся, што ніводнае мовы для гэтага браць ня можна. Розьніца паміж народамі да гэтага дапусьціць ня можа. Калі-б такою, напрыклад, моваю зрабіць мову францускую, дык панам усяго сьвету зрабілася-б Францыя, а другія народы ўтрацілі-б сваё дзяржаўнае значэньне. Тады ўсе народы шукалі-б і давалі-б працу толькі францускім урадоўцам: вучыцялям мовы, судзьдзям, кэльнэрам і інш. і гэтым-бы крыўдзілі жыхароў іншых нацыянальнасьцяў. А іншае мовы не магчыма прыняць за агульную, праз яе вельмі цяжкую граматыку, або выразы. Не надаюцца да агульных з розных прычын, таксама і мовы памёршыя: старагрэцкая, славянская, лацінская, ці гэбрайская. Дзеля гэтага не заставалася нічога іншага, як прыняць нейкую штучную мову, для ўсіх новую, лёгкую, усебакова выпрабаваную, як цяпер значна ўжо ў сьвеце пашыраную мову „эспэранто“, якая не належыць ні да якога народа, ні да якой палітычнай партыі, ці рэлігіі. Было гэта ў 1887 г., калі творац эспэранто, варшаўскі доктар Л. Замэнгоф, жыд па паходжаньню, які радзіўся ў 1859, а памёр у 1917 годзе, надрукаваў і выдаў аб эспэранто сваю першую кніжку. Прапанованае прыхільнымі галасамі вядомых у сьвеце людзей, між якімі быў і пісьменьнік Леў Талстой, дваццаць сем сяброў францускае Акадэміі Навук і інш., эспэранто шырылася хутка. Пасьпехі яго ў апошніх гадох ёсьць вялікія і гэта мова цяпер без рэклямы і разгалоску аб ёй, захоплівае ўсе пласты, усіх народаў. На сусьветнай гандлёвай канфэрэнцыі ў Вэнэцыі 200 гандлёвых прадпрыемстваў дня 2 красавіка 1923 года, прынялі эспэранто за адзіную для ўзаемнага паразуменьня.

„Зьвязь Народаў дня 20 верасьня 1924 г. усімі галасамі прыняў рэзалюцыю, у якой эспэранто прызнаецца памацнічаю моваю ў міжнародных узаемнаадносінах і ўсе праекты іншых штучных моваў—адкінуў.

Канфэрэнцыя „Сусьветнае Тэлеграфічнае Уніі“ ў Парыжу прыняла ў верасьні 1925 г., эспэранто за „выразную“ мову ў тэлеграфіі. Радавы Саюз Рэспублікаў выпусьціў паштовыя значкі і паштоўкі з надпісамі нарасейску і эспэранто.

Урадоўцы паступовых дзяржаў вучацца эспэранто. Шмат, якія дзяржавы ўвялі эспэранто й у школах. Цяпер эспэранто ўжываецца на міжнародных зьездах (на міжнародным пэдагагічным кангрэсе ў 1927 г. у Праве), усе рэфэраты якога перакладзены на эспэранто, замест трох-чатырох іншых моваў.

Сусьветныя фірмы і банкі, бюра вялікіх тарговых прадпрыемстваў, вядуць друкі і абвесткі цэнаў, а таксама і некаторую перапіску на эспэранто. Найважнейшай прычынай такога раптоўнага пашырэньня мовы эспэранта ёсьць тая, што эспэранто надзвычайна лёгкае для навукі. Уся яго граматыка мае ўсяго 16 кароткіх правілаў без асаблівых выкрунтасаў; роду ў ім няма, а з запамогаю канцовак з аднаго слова можна зусім лёгка ўкладаць многа слоў іншых, без вывучваньня гэтых слоў на памяць. Правапіс у ім ёсьць фонэтычны, ці іначай кажучы: пішацца так, як чуецца. Сярэдня абразаваны чалавек адразу ўжо знае 75 прац. са слоўніка эспэранто. Эспэранто ёсьць мілагучным і багатым, так, што ім можна выказаць самыя найтанчэйшыя нраявы сваіх думак. Аб гэтым сьведчыць багатая эспэрантская літэратура, якая мае ня толькі арыгінальныя творы, але і многа розных перакладаў з літэратуры ўсіх культурных народаў.

Міжнародная эспэрантская арганізацыя цяпер ёсьць адною з найвялікшых. Эспэрантысты гуртуюцца ў мясцовых гуртках, мясцовыя гурткі лучацца ў клюбы акружныя і дзяржаўныя, а дзяржаўныя — у **Сусьветны Эспэрантскі Зьвязь** (Universala esperanto asocio) з асяродкам у Жэнэве, у якой пражываюць да 8.000 дэлегатаў і розных консулаў з усіх дзяржаваў і вялікіх местаў сьвету. Пры цяперашнім вялікім падарожным руху эспэрантам паслугоўваюцца скрозь і розныя народы. Што-год адбываюцца сусьветныя эспэрантскія зьезды, якія выразна сьведчаць, як лёгка чужынцам паразумявацца гэтаю для ўсіх даступнаю моваю. Мінулага 1927 г. тысяча клюбаў і гурткоў эспэрантскіх у-ва ўсіх частках сьвету сьвяткавалі 40 угодкі юбілею эспэранто. А на кангрэсе ў Нірнбэргу, які адбыўся ў 1923 г., які назвалі „Цудам сьвету“, 5,000 асоб з 42 розных дзяржаваў Эўропы, Азіі, Афрыкі і Аўстраліі дакладна паразумяваліся з запамогаю эспэранта і гэта выглядала, што нібы гэта былі дзеці аднаго якогась народа. Эспэранто патрэбна і для нас, Беларусаў, калі хочам дакладна ведаць аб усім, што дзеецца ў сьвеце.

Толькі зусім адсталыя і паўдзікія народы ня ўводзяць яшчэ да гэтага часу эспэранто ў пачатковых школах, бо баяцца, каб дзеці працоўных не зразумелі карысьці эспэранто ў міжнародавым клясавым змаганьні.

Трылісьцьнік.

Карэспандэнцыі.

Панскія „слугі“.

(Будслаўск. гм., Вялейскага пав.).

Будучы праездам у Будславе, заўважыў я некалькі хлапцаў, якія ўзьдзяўбурыўшы на свае галовы рагатыя шапкі з пятушкамі, важна ішлі праз рынак. „Што гэта за чудакі і адкуль?“—спытаўся я знаёмага. „Гэта Матыцкае кулка Младзежы“ — чую адказ.

Ці вам ня сорамна, хлапцы, перад людзьмі? Замест таго, каб с'арганізаваўшы Гурток Т-ва Бел. Школы, працаваць разам з іншымі на ніве белар. адраджэньня — лезеце жыўцом у чужацкую скуру! Кіньце лепш гэтыя панскія замашкі, бо час жорстка расплаціцца з вамі.

Ч.

Нашае „жыцьцё“.

(В. Ліпаўка, Докшыцк. гм., Дзісьненскага п.).

Чытаючы сваю газэту, кожны раз бачымо на яе шпальтах карэспандэнцыі з усяе Зах. Бел. Карэспандэнцыі гэтыя ёсьць ня чым іншым, як голасам пратэсту эксплёатуемай працоўнай беднаты. Падзяліцца сваім горам праз родную газэту—адзіны выхад селяніна, бо на мясцох „б'юць і крычаць не даюць“.

Дык, вось, жыта мы пачалі жаць зялёным, бо леташняга хлеба, нягледзячы на частыя дакупы, не хапіла. Дзеля таго, што пожняў амаль што няма — пайшлі касіць дворнае па наст. умове: 2 ч. пану, а 3-ю сабе, пры гэтым трэба зжаць яшчэ пану паўморга жыта. Каб было чым заплаціць падаткі, шмат хто ідзе ў двор Замоша (абш. Слатвінскага) на падзёншчыну. Тут, дык пануе сапраўдны прыгон. За 1 зал. у дзень трэба працаваць на сваім хлебе ад цямна да цямна, не адгінаючы сьпіны, бо над сьпінай стаіць пісар з бізуном. Пісар гэты, па прозьвішчу Пшанічка, зьяўляецца асабліва верным панскім сабакай. Сваю сабачую вернасьць ён даводзіць да таго, што навет за некалькі галінак чаромхі, як гэта здарылася сёлета вясной, ганяецца за дзяцьмі па лесе, абзываючы апошніх пры гэтым рознымі нецэнзурнымі славамі.

Ч.

Як у нас паўстала „паўлючкова Прасьвета“.

(м-ка Остпына, Лідзкага пав.).

У восень 1927 г. з нашага мястэчка аднаму селяніну прышлося быць у Вільні. Там да яго падлізаўся „Паўлючок“ і надаваў яму розных папераў на залажэньне ў нас „Прасьветы“, селянін, прыехаўшы з Вільні, перадаў паперы іншым, каторыя і залажылі Прасьвету да каторае і я сам належаў. У лютым прыходзіць да нас тэлеграма, падпісаная Паўлючком. Вызывае ён нашага сэкрэтара В. О. зараз зьявіцца ў Вільню. Што-ж, мы думалі, важная справа. Пазьбіралі з сяброў складкі і адправілі сэкрэтара да яго. Наш сэкрэтар выяжджаў да Вільні, дык толькі меў за што заехаць туды, а назад спадзяваўся на „Паўлючка“. Бо мы ў газэтах часта чыталі, як ён абходзіўся з сялянамі, каторыя былі на сабраньні, ці прыяжджалі па інш. справам. „Паіў, карміў, да хаты адпраўляў ды грошы даў“. Гэта праўда. Так ён зрабіў зрабіў і з нашым сэкрэтаром. Даў на прыезд да хаты, вярнуў за прыезд да Вільні і даў бібліятэку і шмат розных папераў і яшчэ абяцаў прыслаць нейкі музыкальны інструмант, піяніна, ці што іншае. Гаварыў толькі: „працуйце добра, дык усё будзе“. Вось падумайце якую бібліятэку даў вялікую, аж ня было як зьмясьціць у шафу, але зьбілі з дошчачак скрыначку, дык туды свабодна зьмясьцілі. Паўлючок абяцаў усё нам, бо спадзяваўся прайсьці ў Сойм вашымі галасамі. І вось, перад галасаваньнем прыслаў ён нам фунтаў дзесяць адозваў з нумарамі 37 і прасіў раздаць сялянству. Але мы, атрымоўваючы газэту „Воля Працы“, даведаліся, на чыю карысьць ён працуе, дык навет і не паказвалі сялянству гэтых нумароў. Вось у нас, гэтая „Прасьвета“ „трымаецца і да цяперашняга часу. Ня прыносіць яна нам жаднае карысьці і дзеля гэтага выходжу з яе і раджу гэта самае зрабіць іншым сябрам.

Міхась Кукаль.

Ад Рэдакцыі. „Паўлючок“ „памёр“, але спадак свой пакінуў „Спадару“. Ці ня будзе гэты дзеяч яшчэ больш шкодны для беларускае справы, але народ наш ужо на столькі сьвядомы, што ваўкоў у авечай скуры адрозьніць і пакажа дарогу туды, куды зайшоў са сваёй здрадніцкай працай „Паўлючок“.

За 8-мігадзінны дзень працы!

(в. Міцькавічы, Моўчадзк. вол., Баранав. пав.).

Каля нашае вёскі праходзіць чыгунка, адзіная жывіцелька беззямельных і малазямельных сялян. Карыстаючыся з таго, што галодны і цёмны селянін нідзе ня дзенецца, а мусіць працаваць хоць 15 гадзін у дзень, старэйшы рабочы Юрчык Базыль і дарожны майстар Лукашэвіч, з ст. Моўчадзь, эксплёатуюць нашых сялян, як самі хочуць. Аб васьмігадзінным дні працы няма і ўспаміну. Замест таго, каб канчаць працу ў 3 гадз. папаўдні (зачынаюць працаваць у 6 гадз. раніцы з аднагадзінным перарывам на абед), як гэта ўстаноўлена расьпісаньнем, ст. рабочы Юрчык трымае работнікаў да 5 гадз. вечара, а часамі й пазьней, нічога за гэта ня плацячы. Англійская субота таксама не праводзіцца. Замест таго, каб канчаць працу ў 12 гадз. дня, то яна заўсёды цягнецца да 3 папаўдні. А як толькі хто з работнікаў зьверне на гэта ўвагу пана Юрчыка, то на другі дзень пры праверцы „адважны“ адсылаецца да хаты, а рэшта, каб ня страціць кавалка хлеба, мусіць маўчаць і працаваць столькі, скольки скажа пан Юрчык.

Цікава, ці гэта законы аб васьмігадзінным дні працы зьмянілі самі п. п. Юрчык з Лукашэвічам, ці мо' ён зусім ня існуе на чыгунцы?

Не бракавала-б зацікавіцца гэнай справай адпаведным органам, а інспэктару аховы працы ў асаблівасьці.

Апрача гэтага, работнікі самі павінны ведаць, што здабыча 8-мігадзіннага дня працы каштавала пралетарыяту ня мала высілкаў, а навет і ахвяр і ўтраціць гэную дарагую здабычу будзе вялікай ганьбай для нашых работнікаў. Дзеля гэтага яны самі супольнымі сіламі, а не паадзіному павінны стаць у абароне 8-мігадзіннага дня працы і што не ўдавалася-б зрабіць аднаму, тое ўдасцца зрабіць супольным высілкам, бо кожны ўжо ведае, што ў злучанасьці сіла, якой ня змогуць перамагчы ані Юрчык, ані Лукашэвіч.

Дзед Мацей.

Нам пішуць яшчэ, што:

× **У мястэчку Астрыне, Лідзкага пав.** сяляне яшчэ несьвядомыя. Нашую газэту баяцца чытаць, але толькі здраднікаў — Умястоўскага і „Паўлючка“. Як была Грамада, дык баяліся яе, як ягню. У часе выбараў знайшліся „істінно рускія“ і галасавалі за 20-ку. Дзякуючы такой несьвядомасьці і трусасьці, моладзь гніёе ў п'янстве. Астрынскія сяляне павінны памятаць, што моладзь можна добра выхаваць і адучыць ад п'янства і разбояў толькі ў сваёй роднай арганізацыі. Пара Вам апомніцца і залажыць Гурток Т-ва Бел. Шк., а вынікі не дадуць доўга чакаць.

× **У в. Цераспале Нова-Пагостскай вол., Браслаўскага пав.** малады хлапец Жук з вёскі Ваўчкоў парнуў нажом Кавалёнка, жыхара гэтай-жа вёскі. Кавалёнак хутка памёр, а Жук сядзіць у турме. Рэч дзеялася на „вечарынцы“. Вядома ўжо, якая там была вечарынка.

Моладзь! Кіньце братабойства і працуйце для дабра свайго народу!

× **У м-ку Жодзішках, Вялейскага пав.** абшарніца Карсноўская проста такі зьдзекуецца над сялянамі.

Пасьля 1861 году жодзішскія сяляне атрымалі надзел зямлі з двара Жодзішак. За адну дзесяціну дасталі аж 10! Можа хто падумае, што добра надзялілі сялян. Але, як пасеялі збожжана, то і зьбіраць ня было чаго, дык заставілі на „лес“. За некалькі дзясяткаў гадоў дачакаліся іх патомкі хвайняку, бо лес сапраўдны ня мог вырасьці. Лес гэты „Копны-Бор“, гранічыўся з лесам абшарніка з двара Данюшэўскага. Стаў калоць вока мужыцкі лес пані Карсноўскай: трэба пазбавіць мужыкоў сваго лесу. Прывяла яна каморніка. Сяляне сьпярша хацелі яго прагнаць, але потым запыталіся ў войта Кудзіна, што рабіць? Войт сказаў, сваім войтаўскім розумам, што так трэба і каб мы яго не чапалі. Каморнік памерыў і сялянскі лес далучыў да двара. Пачалі сяляне судзіцца, але якраз выбухнула вайна і ўсе паперы былі вывезеныя. Пасьля вайны сталі нашы сяляне вяртацца на Бацькаўшчыну. Будынкі былі зьнішчаны. Пачалі вазіць дрэва з нашага лесу, каб адбудавацца. Мала па-малу адбудаваліся. Аж лясьнікі з паліцыяй пачалі аблічаць нашыя будынкі і дапытвацца, дзе бралі лес. Усе адкрыта сказалі, што ў „Капны-Бары“. Тады абшарніца падала ў Міравы Суд, які не разглядаючы, чыя ўласнасьць, засудзіў нас, больш як 30 гаспадароў на некалькі тысячаў злотых. За нас сьведчылі цэлыя вёскі, аднак, апраўдацца мы не маглі.

Абшарніца Карсноўская ахвяравала нашыя сьлёзы на касьцёлы ў двары Данушэўскім і Жодзішках. Вось бачыце, паважаныя чытачы, куды нашы грошы ідуць?

× **Моладзь у в. Пяшчатка-Палавецкая, Берасьцейскага п.** не стаіць на такім роўні, як гэта трэба было-б працоўнай моладзі. Дарагія браты, ці мы дзеля таго радзіліся, каб толькі цягнуць ярмо нядолі? Не! Мы не павінны больш так жыць! Няхай нас гоняць, сочаць за намі—мы, як адзін, павінны стаць у рады барацьбітаў за асьвету працоўнаму народу!

З жыцьця Горадні.

× **Раней лігіяністка—цяпер крыміналістка.** Наша Горадня, хоць ні Парыж які, ці Бэрлін, але ўсё-ж такі можа канкураваць з заграніцай, асабліва ў галіне „вынаязкаў“, а жывуць у гэтым горадзе людзі быццам у кіне-тэатры: кожны дзень чалавек можа ўбачыць розных рэчаў: і драмаў і трагэдыяў і камэдыяў і г. д., дык дзеля таго, што гэтая „трагікамадыя“, якой я хачу падзяліцца з паважанымі чытачамі „адыгрывалася ў нас, а таксама, здаецца, у Зах. Беларусі першы раз, дык варта ведаць. Мінуў ужо тыдзень, як у Горадні паліцыя арыштавала адну жанчыну, быўш. легіяністку, якая, будучы ў Вільні безработнай, знайшла „вынаязак“, як выйсьці з гэтага прыкрага палажэньня, знайсьці грошы і пажыць так, як жыла за „przeszłych czasów“, калі служыла ў легіёнах. Перадусім, купіла сабе мужчынскую адзежу, апранулася і, дастаўшы дзесьці пашпарт фальшывы, на імя Язэпа Вароніча, пайшла шукаць сабе кабеты (ведама, з грашмі) дзеля жаніцьбы. Праз нейкі час занайшла-такі такую кабету і ў адным з касьцёлаў у хуткім часе адбыўся шлюб. Вось гэтая „маладая пара“ пайшла ў хату да жонкі дзеля супольнага шчасьлівага жыцьця, але ня доўга цягнулася гэтае „супольнае жыцьцё“, бо ўсяго два тыдні: яна, абрабіўшы сваю справу, уцякла. Як яны пражылі два тыдні? — я ня ведаю, даволі таго, што калі яна ўцякла, жана гэтага Вароніча замэльдавала ў паліцыю, што яе муж, узяўшы грошы, дзесьці прапаў бяз весткі і кажа: „пашукайце мо' бандыты якія абрабавалі і забілі“. А гэты вось „муж“ уцёкшы, ад яе, прыехаўшы да Горадні, ізноў знайшоў сабе кабетку і запрапанаваў ёй жаніцца. Тая пасьля доўгага намыслу згадзілася і ўжо далі на запаведзі ў Бярнадынскім касьцёле і ксёндз навет з амбоны адзін раз казаў, што „Язэп Вароніч жэніцца з такой-та кабетай.... (выбачайце мяне, але прозьвішча гэтай кабеты дзеля таго, што яна прасіла не зьмяшчаць у прэсе, не падаю), але гэтым разам да шлюбу не дайшло, бо неяк перад другой запавядзяй застала арыштавана і выясьнілася, што гэта ня мужчына, а кабета. Мала гэтага, паліцыя думала, што мае дачыненьне з гэрмафрадыткай і пазвала лекарскую камісію, якая пасьля баданьня сьцьвердзіла, што гэта ёсьць не гэрмафрадытка, а самая настаяшчая жанчына.

Хваля.

Рэдактар-Выдавец: М. Масьцерпа.

Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая 22.